# Спорт і правы чалавека

## квартальная аналітыка
## красавік-чэрвень 2024

FAIRPLAY
SPORT FOR FAIR, EQUAL AND INCLUSIVE WORLD

Human constanta

# Зьмест:

Уводная........................................................1

Что ня так з правамі чалавека ў спорце ў Беларусі?.. 3

Правы жанчын ў спорце.................................... 5

Правы ЛГБТК+ людзей у спорце............................7

Права на здароўе.............................................9

Спартовая форма і правы чалавека.................... 11

EURO-2024...................................................12

Іншыя навіны ў сфэры спорту і правоў чалавека... 14

# Сьпіс абрэвіятур

МАК – Міжнародны Алімпійскі Камітэт
DFB – Deutscher Fußball-Bund
DBU – Dansk Boldspil-Union
FFF – Fédération Française de Football
FIFA – Fédération Internationale de Football Association
FIFPRO – The Fédération Internationale des Associations de Footballeurs Professionnels
MLS – Major League Soccer
NBA – National Basketball Association
NHL – National Hockey League
NHLPA – National Hockey League Players' Association
NWSL – National Women's Soccer League
UEFA – The Union of European Football Associations
USWNT – United States Women's National Soccer Team
WSL – Women's Super League

# Уводная

У гэтым дакумэнце мы прааналізавалі найбольш значныя падзеі і навіны ў спорце за красавік-чэрвень 2024 года праз прызму міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека.

У Беларусі працягваюцца перасьледы прадстаўні_ц спартовай індустрыі, якія не згодныя з беларускімі дэ-факта ўладамі, што зьяўляецца праявай сыстэматычнага і паўсюднага парушэньня правоў чалавека ў краіне. Падставай для перасьледу ў аналізаваны перыяд паслужылі ўдзел у мірных акцыях пратэсту ў 2020 годзе, зьлівы пэрсанальных даных сілавікоў, удзел у «экстрэмісцкім фармаваньні», вылучэньне кандыдатуры ў Каардынацыйную раду, надпіс «zyvie Belarus». Працягваецца практыка запісу і распаўсюджваньня «пакаяных» відэа, што парушае фундаментальнае права на абарону ад прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня і пакараньня.

У сфэры жаночага спорту ўсё больш клюбаў і фэдэрацыяў імкнуцца разьвіваць трэніровачную інфраструктуру і арганізоўваюць матчы на стадыёнах, якія зьмяшчаюць дзясяткі тысяч глядач_ак, што сьведчыць аб росце цікавасьці да жаночых гульняў ці прадастаўленьні інфраструктуры маштабаў адпаведных запыту, а таксама разьвіцьці індустрыі. Аднак, гуліні ўсё яшчэ вымушаныя змагацца за спрыяльныя ўмовы і справядлівую аплату працы. Гэтыя падзеі ўплываюць на фундамэнтальныя правы чалавека, у тым ліку на роўнасьць і недыскрымінацыю. Вырашэньне гэтых праблем мае важнае значэньне для ўстойлівага развіцьця жаночага спорту і абароны правоў чалавека.

Чэрвень – месяц гонару ЛГБТК+ супольнасьці. Аналізаваны перыяд вызначыўся вялікай колькасьцю акцый падтрымкі ў самых розных відах спорту. Але таксама па-ранейшаму мае месца дыскрымінацыя і непрыманьне. Процілеглыя тэндэнцыі паказваюць на прагрэс, але таксама падкрэсьліваюць неабходнасьць сыстэмных намаганьняў па стварэньні інклюзіўнага і бясьпечнага асяродьдзя для кожна_й.

У аспэкце права на здароўе заўважныя пазытыўныя тэндэнцыі. Усё больш арганізацыяў і федэрацыяў клапоцяцца аб здароўі спарто_вак па прынцыпе "people-first". У прыватнасьці новаўвядзеньні датычацца хуткага рэагаваньня на выпадкі страсеньня мозгу, спэцыяльных пратаколаў па забесьпячэньні дабрабыту жанчын і праэкта, накіраванага на пошукі спосабаў зніжэньня рызыкаў траўм у жаночым футболе. Самі атлет_кі працягваюць казаць аб значнасьці мэнтальнага здароўя нароўні зь фізычным. Забесьпячэньне доступу да належнай медыцынскай дапамогі, прафілактыцы траўмаў і падтрымцы мэнтальнага здароўя абараняе дабрабыт спарто_вак у іхняй кар'еры.

Мы ўжо не аднойчы расказвалі пра тое, як спартовая форма можа быць выкарыстаная ў якасьці спосабу прасоўваньня правоў чалавека і сацыяльна-значных пытаньняў. У матэрыяле разгледжаны падобныя прыклады для прыцягненьня ўвагі да супольнасьці з парушэньнямі слыху, праблемах хатняга гвалту, а таксама расізму, антысемітызму, гамафобіі, сэксізму і іншых формаў дыскрымінацыі. Гэта важна, бо такім чынам шырокая прывабнасьць і асьвятленьне спорту ў СМІ выкарыстоўваецца для вырашэньня найважнейшых праблем у сфэры правоў чалавека, і садзейнічае развіцьцю інклюзіўнай культуры як знутры, так і па-за межамі спартовай супольнасьці.

Адным з самых значных і глябальных спартовых мерапрыемстваў за аналізаваны перыяд стаў Чэмпіянат Эўропы па футболе EURO-2024. Глябальныя спартовыя мерапрыемствы часта становяцца плятформай для абмеркаваньня значных грамадзкіх пытаньняў, а таксама дапамагаюць зьвярнуць увагу на праблемы ў аспэкце правоў чалавека. Вельмі важна, каб арганізатар_кі, удзельні_цы і глядач_кі супрацоўнічалі ў прасоўваньні інклюзіі, барацьбе з дыскрымінацыяй і забесьпячэньні захаваньня правоў чалавека

на ўсіх узроўнях на гэтых глябальных мерапрыемствах. Такі падыход можа прывесьці да доўгатэрміновых пазытыўных зьменаў у спартовым сьвеце і грамадзтве ў цэлым.

Навіны, якія распавядаюць аб выкарыстаньні штучнага інтэлекту для абароны атлет_ак, а спартовай арэны – як плятформы для заклiку да галасаваньня на парлямэнцкіх выбарах, роўна як чарговыя сутыкненьні фанат_ак з наступствамі рознай ступені цяжкасьці, барацьба спарто_вак за права на справядлівую аплату працы і нават прасоўваньне позвы аб зьмене клімату, зьяўляюцца сьведчаньнем шырокага ўплыву спорту на ўсе сфэры жыцьця з мэтай пабудовы разнастайнага і інклюзіўнага грамадзтва.

# Што ня так
# з правамі чалавека
# ў спорце ў Беларусі?

У канцы траўня ў кватэру бацькоў лёгкаатлеткі Krystsina Tsimanouskaya прыйшлі зператрусам супрацоўнікі Следчага камітэта (далей – СК), пра гэта спартоўка паведаміла ў сацыяльных сетках. Новая хваля ператрусаў прайшла ў Беларусі ў перыяд перад выбарамі ў Каардынацыйную раду (далей – КС), а СК завялі крымінальныя справы на ўсіх кандыдат_ак у КС. Tsimanouskaya зьяўлялася прэтэндэнткай на месца ў КС.

Раней асуджаны на 1,5 гады калёніі за «абразу прэзідэнта» бодзібілдар Aliaksandr Sharabaiko зноў быў абвінавачаны па трох артыкулах КК РБ[1], у тым ліку па артыкуле 361-1 КК (удзел у экстрэмісцкім фармаваньні). У выніку Sharabaiko быў прыгавораны да 6 гадоў калёніі.

У сузаснавальніка Свабоднага аб'яднаньня спартоўцаў (SOS BY) і журналіста Andrei Hnet, які быў затрыманы ў Сэрбіі ў канцы кастрычніка 2023 года, пагоршыўся стан здароўя ў турме. Пра гэта працоўнай групе дэпутатаў Эўрапарлямэнта паведамілі Народнае антыкрызіснае ўпраўленьне (НАУ). Сам Hnet таксама накіраваў ліст у суд. 13 чэрвеня Вышэйшы суд Сэрбіі прыняў рашэньне аб экстрадыцыі Andrei Hnet, пра гэта журналіст паведаміў у сацсетках. Па словах Hnet, суд не знайшоў падставаў, якія перашкаджаюць яго выдачы. На дадзены момант журналіст знаходзіцца пад хатнім арыштам, а ягоныя абаронцы падрыхтавалі апэляцыйную скаргу на рашэньне суда.

Pavel Pashkevich, вядучы мерапрыемстваў, які працаваў на матчах баскетбольнага клюба «Мінск» быў затрыманы. Нагодай стала фота, на якім Pashkevich трымае ў руцэ мікрафон з надпісам “ZYVIE BELARUS”. У адным з праўладных Telegram-каналаў было апублікаванае «пакаянае» відэа, у якім вядучы прызнаецца ва ўдзеле ў мірных акцыях пратэсту ў 2020 годзе ў Менску, а таксама адпраўцы даных аб перамяшчэньні «сілавікоў» праз рэсурс «Чорная кніга Беларусі»[2]. Па інфармацыі з Telegram-канала, Pashkevich пагражае тэрмін да 5 гадоў пазбаўленьня волі.

СК пачалі «адмысловую вытворчасьць» супраць інструктара па краў-мага Hennadzi Kapitanov. Ён абвінавачваецца па чатырох артыкулах КК – распальваньне варожасьці (ч. 1 арт. 130 КК), заклікі да дзеяньняў супраць нацыянальнай бясьпекі (ч. 3 арт. 361 КК), абраза прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) і абраза прэзідэнта (ч. 1 ст. 368 КК).

Палітычны перасьлед прадстаўні_ц спартовай індустрыі зьяўляецца праявай паўсюдных і сыстэматычных парушэньняў правоў чалавека ў краіне, у прыватнасьці – права на працу і прафэсію, свабода выказваньня меркаваньня, свабода ад зьневажальнага чалавечую годнасьць абыходжаньня. Неабходна працягваць падвышаць дасьведчанасьць аб гэтых парушэньнях, у тым ліку на міжнародным узроўні, і аказваць падтрымку прадстаўні_цам індустрыі пад перасьледам.

Дэ-факта ўлады Беларусі працягваюць выкарыстоўваць размытае ў заканадаўстве паняцьце «экстрэмізм» з мэтай палітычных перасьледаў, з якімі сутыкаюцца і спартоў_кі. Так, Міністэрства інфармацыі Беларусі прызналі Instagram-акаўнт баскетбалісткі Katerina Snytsina «экстрэмісцкім матэрыялам».[3]

Marjolen Nekesa, футбалістка зборнай Кеніі і чэскага клюба “Slavia Praha”, 18 месяцаў чакала, пакуль яе агент Dmitri Margolenko выплаціць ёй грошы за выступы ў складзе ФК «Мінск». У перыяд працы ў клюбе вясной 2022 года спартоўцы даводзілася

1 КК РБ – Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь.
2 «Чорная кніга Беларусі» – ініцыятыва, якая ўзнікла ў пачатку мірных пратэстаў у 2020 годзе. У яе Telegram-каналах публікаваліся асабістыя дадзеныя сілавікоў, судзьдзяў, чыноўні_ц, якія могуць мець дачыненьне да зьбіцьця мірных пратэстоўцаў, неправамерных судоў і іншых парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі.
3 Рэспубліканскі сьпіс экстрэмістскіх матэрыялаў.

самастойна арэндаваць сабе жытло. У канцы першага месяца Nekesa павінна была атрымаць 5500BYN - беларускіх рублёў (≈1556€), але атрымала толькі 1300BYN (≈367€), частку з якіх прыйшлося аддаць за арэнду. У той жа сітуацыі аказалася яе каляжанка зь Нігерыі. Па словах футбалісткі, жыць на гэтыя грошы было вельмі складана. Праз тры месяцы Nekesa падала скаргу ў Палату па вырашэньні спрэчак FIFA, а ўлетку 2022 года перайшла ў "Slavia Praha". Аднак, па розных прычынах агент зацягваў выплату заробленых футбалісткай грошай на працягу многіх месяцаў пасьля. Nekesa атрымала выплату часткі сумы, але ўсё яшчэ чакае выплаты рэшты ў $4200. Гэта не першы прыклад, які паказвае, што беларускі футбол не гатовы да трансфэраў такога ўзроўню з прычыны немагчымасьці даць спрыяльныя і справядлівыя ўмовы працы для гул_інь у адпаведнасьці зь міжнароднымі стандартамі. Раней мы распавядалі пра кейс гуліцы з Канады Patricia Lamanna у тым жа ФК «Мінск».

# Правы жанчын у спорце

Jamie Chadwick стала першай жанчынай-пераможцай гонак Indy NXT Race за апошнія 15 год, трэцяй за ўсю гісторыю і першай за ўвесь час, якая выйграла гонку па шашы. Doris Burke афіцыйна стала першай жанчынай-аналітыкіняй фінала чэмпіянату NBA – адной з чатырох галоўных прафэсійных амерыканскіх спартовых ліг. «Сэнс для мяне складаецца ў тым, што калі гэтае прызначэньне нейкім чынам палегчыць жыцьцё жанчынам у спорце ці неяк дапаможа ім у гэтым працэсе, то нічога ня можа быць больш значным», – пракамэнтавала Burke сваё прызначэньне.

Першы ў гісторыі жаночы клюбны Чэмпіянат сьвету прызначаны на 2026 год. Турнір будзе праводзіцца кожныя 4 гады, першы з якіх пройдзе ў студзені-лютым 2026 года, у турніры прымуць удзел 16 каманд, канкрэтныя кваліфікацыйныя крытэры пакуль не зацьверджаныя. Спаборніцтва дасьць магчымасьць сустрэцца клюбам, у якіх рэдка бывае такая магчымасьць у жаночым футболе. Аднак яшчэ адзін турнір у расклад зноў можа справакаваць дыскусіі аб павышаных нагрузках і рызыках траўмаў.

Жаночы Chelsea FC упершыню ў гісторыі прадалі ўсе квіткі на матч з FC Barcelona у паўфінале Лігі Чэмпіёнаў на стадыёне Stamford Bridge. Умяшчальнасьць стадыёна – 41000 чалавек. Жаночы Chelsea FC звычайна гуляюць на пляцоўцы Kingsmeadow, умяшчальнасьць якога 4350 чалавек.
Жаночая каманда Arsenal FC правядуць большасьць дамашніх матчаў наступнага сэзона на стадыёне Emirates. Умяшчальнасьць стадыёна – 60704 чалавек. У сярэднім наведвальнасьць матчаў Arsenal FC на Emirates вырасла на 11% у параўнаньні з мінулым сэзонам. Гэта важнае рашэньне як для гулінь, так і для фанат_ак.
Жаночая каманда Liverpool FC у наступным сэзоне будуць гуляць на новым хатнім стадыёне Totally Wicked Stadium, умяшчальнасцю 18000 глядач_ак. Новаўвядзеньнем для каманды стане таксама і спецыяльна зробленая распранальня.
Manchester City FC будуюць новую трэніровачную базу спэцыяльна для жаночай каманды. Гэта дасьць камандзе асобнае і сучаснае асяродзьдзе для трэніровак і аднаўленьня.

Мы можам назіраць за тым, як усё больш жаночых клюбаў працягваюць інвэставаць і імкнуцца даць гулінам лепшыя ўмовы і падтрымку, што ў сваю чаргу спрыяе дасягненьню імі посьпеху і развіцьцю спорта ў цэлым.

З 1 чэрвеня ў сілу ўступілі пратаколы FIFA аб абароне дабрабыту жанчын у футболе, новаўвядзеньні ў прыватнасьці датычацца здароўя і мацярынства. Згодна з новымі правіламі, гулінам і трэнеркам прадастаўляецца мінімум 14 тыдняў аплочваемага дэкрэтнага адпачынку і мінімум 8 тыдняў аплочваемага адпачынку для тых, хто ўсынавілі/ўдачарылі дзіця малодшае за 2 гады. Таксама мінімум 8 тыдняў адпачынку аплочваецца жанчынам, якія не зьяўляюцца біялагічнымі бацькамі нованароджаных. Акрамя таго, рэглямэнт дазваляе гулінам браць аплачаныя выходныя з матчаў або трэніровак з прычыны мэнструальнага здароўя. Галоўная спецыялістка FIFA па жаночым футболе Dame Sarai Bareman заявіла, што новыя меры прызнаюць той факт, што гуліні зьяўляюцца галоўнымі зацікаўленымі бакамі ў індустрыі.

Жаночая зборная Паўднёвай Карэі па футболе змагаюцца за свае правы, гэндарную роўнасьць і паляпшэньне ўмоваў працы. Асноўнымі праблемамі гуліні называюць адрозненьні ў абсталяваньні трэніровачных баз і ўмоваў у параўнаньні з мужчынскай камандай, нестабільныя графікі і нізкі ўзровень арганізацыі паездак і, як сьледзтва, адсутнасьць неабходнага часу для аднаўленьня. Асноўнай прычынай такіх умоваў працы чарговы раз зьяўляецца адсутнасьць неабходнага фінансаваньня.

Тры гуліні зборнай Аргентыны, Julieta Cruz, Laurina Oliveros і Lorena Benítez, пакінулі

каманду ў знак пратэсту з-за спрэчак аб аплаце працы і дрэнных умоваў. Аб сваім сыходзе гуліні паведамілі ў сацсетках. «Мы дасягнулі таго моманту, калі стаміліся ад несправядлівасьці, ад таго, што нас не шануюць, не чуюць і, што яшчэ горш - зьневажаюць. Нам патрэбныя паляпшэньні для жаночай зборнай Аргентыны па футболе, і я кажу не толькі аб фінансах. Я кажу аб трэніроўках, абедах, сьняданках», – заявіла Julieta Cruz у сваім пасьце ў Instagram.

Падчас матчу з Santos FC гуліні Corinthians FC выступілі з пратэстам – яны закрылі вушы і раты падчас выкананьня нацыянальнага гімна Бразіліі. Пратэст быў накіраваны ў адрас трэнера Santos, Kleiton Lima, які раней быў абвінавачаны ў харасмэнце, але вярнуўся ў клюб праз 7 месяцаў. Праз тыдзень Lima зноў пакінуў клюб, бо, паводле ягоных словаў, ён атрымліваў пагрозы забойствам і папрасіў часовы адпачынак.

Шматлікія прыклады разьвіцьця інфраструктуры спэцыяльна для жанчын сьведчаць аб станоўчым зруху ў бок большай гэндарнай роўнасьці і прызнаньня ўнёску жанчын у спорт. Аднак, атлет_кі працягваюць змагацца за справядлівыя ўмовы, роўную аплату працы і супраць харасмэнта. Гэтыя падзеі закранаюць асноўныя правы чалавека, у тым ліку права на роўнасьць і недыскрымінацыю, права на справядлівую аплату і спрыяльныя ўмовы працы, і гавораць аб тым, што для забесьпячэньня поўнай роўнасьці неабходна зрабіць яшчэ большую працу. Далейшае вырашэньне гэтых праблем ёсьць неабходным для ўстойлівага разьвіцьця жаночага спорту і абароны правоў чалавека.

# Правы ЛГБТК+ людзей у спорце

Чэрвень традыцыйна лічыцца месяцам гонару ЛГБТК+ супольнасьці (Pride Month). У гэтым годзе мы маглі назіраць шматлікія акцыі падтрымкі.

Гуліні USWNT 1 чэрвеня надзелі футболкі з нумарамі ў колерах Progress Pride. "Football v Homophobia" арганізавалі Football Pride, які прайшоў пад эгідай Chelsea FC на стадыёне Stamford Bridge – праграма была прысьвечана футбольнай культуры ЛГБТК+, мерапрыемствам і дыскусіям, а таксама магчымасьці для знаёмстваў. NHL і NHLPA аб'ядналіся, каб адсьвяткаваць Pride у чэрвені і будуць працягваць цягам ўсяго сэзона. 32 клюбы NHL правялі Pride Night і сабралі сродкі для падтрымкі каля 100 ЛГБТК+ арганізацый. 16 чэрвеня ў Лёндане ў спартовым цэнтры Crystal Palace прайшоў першы фестываль ЛГБТК+, заклікаы разбурыць бар'еры для заняткаў спортам. MLS аб'ядналіся з Adidas, каб прадставіць «вясёлкавую» лінейку адзеньня. Ініцыятыва Pride Swim 2024 стартавала на Чэмпіянаце Вялікай Брытаніі па водных відах спорту – заплывы накіраваны на аб'яднанне ЛГБТК+ супольнасьці і аднадум_ак, каб падтрымаць іх фізычнае і мэнтальнае здароўе, садзейнічаць інклюзіі і сабраць грошы для дабрачыннай арганізацыі Switch.

NWSL аб'ядналася з арганізацыяй Athlete Ally, каб павысіць узровень ЛГБТК+ інклюзіўнасьці ў жаночым футболе. Яны апублікавалі відэа "Pride Plays Here", якое таксама трансьлявалася падчас усіх чэрвеньскіх матчаў NWSL, і аднавілі ініцыятыву Playing for Pride 365 – за кожны гол і дзейсную перадачу, залічаныя ў чэрвені, Ліга ахвяравалі $150. На працягу месяца заўзятар_кі таксама маглі прыняць удзел у Pride Night сваёй улюбёнай каманды і набыць мерч, 10% ад выручкі якога Ліга ахвяравалі ў Athlete Ally.

На час правядзеньня Алімпійскіх гульняў-2024 у Парыжы пад кіраўніцтвам арганізацыі "Fier-Play" і ў супрацоўніцтве з арганізацыяй "Paris 2024" і іншымі зацікаўленымі бакамі, быў адкрыты The Pride House – гэта бясьпечная, даступная і гасцінная прастора для ўсіх: прадстаўні_ц ЛГБТК+, спарто_вак і аднадум_ак.

У мэтах барацьбы з гамафобіяй 34-ты, заключны, тур Лігі-1 быў азнаменаваны шэрагам акцый у падтрымку гэтай мэты. На футболках гульцоў зьявіўся надпіс "No to Homophobia", а лёга Лігі быў выкананы ў тэматычным каляровым выкананьні. Аднак гулец AS Monaco FC Mohamed Camara заклеіў участкі формы з элементамі акцыі па барацьбе з гамафобіяй. Ён таксама адмовіўся ад перадматчавай фатаграфіі, на якой каманды Monaco і Nantes стаяць за банэрам у падтрымку Міжнароднага дня барацьбы з гамафобіяй, біфобіяй, інтэрфобіяй і трансфобіяй. Пры гэтым гульню з Monaco прапусьціў нападаючы FC Nantes Mostafa Mohamed, які другі год запар застаецца па-за заявай сваёй каманды з-за нежаданьня прымаць удзел у акцыі супраць гамафобіі.

У аналізаваны перыяд мы маглі назіраць шматлікія прыклады падтрымкі ЛГБТК+ супольнасьці ў спорце. Аднак былі і выпадкі нежаданьня выказваць падтрымку, што можа сьведчыць аб супраціве ці неразуменьні прычын і наступстваў дыскрымінацыі. Гэта двaістасьць падкрэслівае неабходнасьць пастаянных намаганьняў па стварэньню інклюзіўнага асяродзьдзя. Для прасоўваньня правоў ЛГБТК+ у спорце вельмі важна павышаць дасьведчанасьць, укараняць антыдыскрымінацыйную палітыку і забясьпечваць актыўную падтрымку і абарону прадстаўні_ц ЛГБТК+ на ўсіх узроўнях.

Валейбалістак баскетбольнага клюба «Лакаматыў» абвінавацілі ў «ЛГБТ-прапагандзе». Такі артыкул зьявіўся на сайце клюба-суперніка «Дынама» пасьля іх паражэньня ў паўфінале расейскай Супэрлігі. У артыкуле ўказалі на «жахлівыя жэсты, якія імітуюць палавы акт», «аднаполыя пацалункі ў вусны і іншыя мярзоты», і заявілі аб «дэманстрацыі поўнага грэбаваньня культурай і маральнымі каштоўнасьцямі краіны». «Міжнародны

грамадзкі рух ЛГБТ» з канца 2023 года прызнаны ў Расеі экстрэмісцкім, забаронена яго «прапаганда», у прыватнасьці сярод моладзі, асаблівая ўвага надаецца значнасьці «традыцыйных каштоўнасьцей», закрываюцца «гей-клюбы», на ЛГБТК+ актывіст_ак заводзяцца крымінальныя справы.

# Права на здароўе

Ружовая картка будзе выкарыстоўвацца ў якасьці меры для гарантаваньня бясьпекі футбалістаў падчас матчу. У новым рэгламенце, апублікаваным Канфедэрацыяй футбола Паўднёвай Амерыкі (CONMEBOL), гаворыцца, што ў выпадку «замены з-за падазрэньня на чэрапна-мазгавую траўму і страсеньне мозгу» трэнерскі штаб паведамляе аб неабходнасьці замены пры дапамозе дэманстрацыі ружовай карткі галоўн_ай або рэзерво_вай арбітар_цы. Новаўвядзеньне будзе прымяняцца на бліжэйшым Кубку Амерыкі (21 чэрвеня-15 ліпеня). Пры гэтым замена з-за страсеньня мозгу можа быць праведзена незалежна ад колькасьці зробленых замен да моманту яе ўзнікненьня. Замацаваньне дадзенай практыкі зьяўляецца прыкладам рэалізацыі прынцыпу “people first”: захаваньне здароўя спартоў_кі стаіць на першым месцы пры правядзеньні спаборніцтваў.

Merel van Dongen, абаронца зборнай Нідэрляндаў і чаліня Глябальнай рады гул_інь FIFPRO, у рамках падкаста The Guardian's Women's Football Weekly выказалася аб праблеме высокіх нагрузак і выгараньні ў футболе. Рашэньнем праблемы футбалістка бачыць фіксаваны адпачынак. У той жа час, роўна як і перагружаны, «недагружаны» каляндар таксама зьяўляецца праблемай, пры тым спецыфічнай менавіта для жаночага футбола. Інавацыі павінны ўключаць у сябе пашырэньне канкурэнцыі і адэкватнае плянаваньне гульняў.[4]

Nike, PFA, FIFPRO і ўніверсітэт Лідса Бэкета аб'ядноўваюцца ў праэкце ACL, прысьвечанаму прафэсійнаму жаночаму футболу. У праэкце прымуць удзел клюбы WSL, якія стануць аб'ектам трохгадовай дасьледчай ініцыятывы, закліканай знайсьці спосабы зьніжэньня частаты траўмаў ПКВ (пярэдняя крыжападобныя вязы). У апошнія гады ў жаночым футболе мы можам назіраць сапраўдную эпідэмію траўм ПКВ. Гэтыя траўмы ў 2-6 разоў часьцей здараюцца ў жанчын, чым у мужчын, а 2/3 траўмаў адбываецца пры адсутнасьці фізычнага кантакту. Нягледзячы на тое, што даследаваньне будзе сканцэнтравана на клюбах WSL, яго вынікі плянуецца распаўсюдзіць сярод ліг і федэрацый па ўсім сьвеце. Праэкт зьяўляецца адказам на патрэбы гулінь ў правядзеньні дадатковых дасьледаваньняў у гэтай галіне, а таксама спрыяе разьвіцьцю галіны ў больш шырокім сэнсе.

Згодна з некаторымі дасьледаваньнямі, мяркуецца, што абутак зьяўляецца адным з фактараў, які вызначае колькасьць траўмаў ПКВ і іншых доўгатэрміновых траўмаў. Да апошніх дзьвух гадоў гуліні былі вымушаныя насіць абутак, распрацаваны з улікам мужчынскай або дзіцячай анатоміі. У апошнія гады вытворцы абутку, у тым ліку такія буйныя як Adidas і Nike, сталі выпускаць абутак спецыяльна для жанчын, з улікам іх анатоміі і запатрабаваньняў. У аналізаваны перыяд новую пару такога абутку - бутцы F50, прэзэнтавалі Adidas.

Права на здароўе павінна быць фундамэнтальным і прыярытэтным у спорце з-за апрыёры ўласцівых яму фізычных нагрузак і павышанай рызыкі для здароўя. Прыярытэт здароўя ў спорце спрые стварэньню больш бясьпечнага асяродьдзя, паляпшэньню спартовых вынікаў, абароне дабрабыту атлет_ак. Такі клопат аб здароўі неабходны для стварэння ўстойлівай і этычнай спартовай індустрыі.

Lionel Messi выступіў за дасьведчанасьць мужчын аб мэнтальным здароўі. Футбаліст распавёў аб сваім досьведзе тэрапіі і як гэта становача паўплывала на яго жыцьцё. Спартоў_кі сутыкаюцца з вялізарным ціскам як на поле, так і па-за ягонымі межамі, на працягу ўсёй кар'еры. Адкрытасьць Messi можа аказаць пазітыўны ўплыў

4 Справаздача аб працоўнай нагрузцы на жаночы Чэмпіянат сьвету па футболе 2023 года.

на пераадоленьне стыгмы, асабліва для маладых спартоўцаў, і заахвоціць людзей звяртацца па дапамогу.

Per Mertesacker, прафэсійны футбаліст і трэнер, цяперашні мэнэджар Arsenal FC Academy, адкрыў цэнтр мэнтальнага здароўя ў Паўночным Лёндане. «Гэтая праблема блізкая мне па духу. Наш мэнтальны дабрабыт такі ж важны, як і фізычны», – заявіў футбаліст.

Хоць тэма мэнтальнага здароўя ў спорце ўсё яшчэ застаецца стыгматызаванай, намаганьні з боку асобных атлет_ак, спартовых федэрацыяў і клюбаў, партнэрскіх арганізацыяў аказваюць свой пазітыўны ўплыў на супольнасьць і служаць падтрымкай для ўсіх у спартовай індустрыі.

# Спартовая форма і правы чалавека

Lionesses FC павышаюць дасьведчанасьць аб супольнасьці з парушэньнямі слыху з дапамогай спэцыяльных перадматчавых джэрсі. У адборачным матчы EURO-2025 са Швецыяй гуліні выйшлі ў футболках, імёны на якіх былі напісаныя брытанскай мовай жэстаў (BSL). Такім чынам футбалісткі прасоўваюць выкарыстаньне і навучаньне BSL і нагадваюць аб тым, што футбол можа быць больш даступным як для заўзятар_ак, так і для гул_інь.

BSC Young Boys у супрацоўніцтве з Amnesty International прадставілі адмысловую форму ад Nike з мэтай выступіць супраць расізму, антысемітызму, гамафобіі, сэксізму і дыскрымінацыі любога роду ў надзеі на разнастайнае і адкрытае грамадзтва.

Corinthians аб'ядналіся з Nike для прасоўваньня ініцыятываў па барацьбе з расізмам і прадставілі форму на сэзон 2024/25. Як мінімум, 41% гул_інь, якія выступаюць на галоўных чэмпіянатах у Бразіліі, сутыкнуліся з расізмам. Сярод падтрымліваемых ініцыятыў – заняткі па расавай граматнасьці для спарото_вак і іншых супрацоўні_ц.

Футбалісты «Пары НН» выйшлі на поле ў форме, з вышыўкай ад падапечных Ніжагародскага крызіснага цэнтра (НЖКЦ), каб прыцягнуць увагу да праблемы хатняга гвалту. Anastasia Ermolaeva, заснавальніца і кіраўніца НЖКЦ, адзначыла: «Па зьвестках даследчыкаў, узровень агрэсіі пасьля футбольнага матчу павялічваецца на 8,5%. У той жа час адрэналін і назапашаныя эмоцыі не абавязкова прыносіць дадому, прычыняючы боль блізкім, – і тут спорт лёгка можа быць нашым сябрам».

Спартовая форма можа служыць магутным сродкам прасоўваньня правоў чалавека, пасланьнем для павышэньня дасьведчанасьці ў многіх пытаньнях і дэманстрацыяй салідарнасьці з рознымі сацыяльнымі групамі. Такая бачнасьць на глябальнай спартовай арэне можа выклікаць дыскусіі, паўплываць на грамадзкую думку і прымусіць арганізацыі і федэрацыі зьмяняць сітуацыю.

# EURO-2024

У лістападзе 2023 года, напярэдадні UEFA EURO-2024, UEFA, DFB, EURO 2024 GmbH і іншыя прынялі «Дэклярацыю правоў чалавека для EURO-2024», заявіўшы, што ўсьведамляюць свае абавязацельствы і адказнасьць у галіне правоў чалавека пры арганізацыі і правядзеньні мерапрыемства. У дэклярацыі былі адлюстраваныя абавязацельствы, аналіз рызыкаў, мэханізм разгляду скаргаў і справаздачнасьць.[5]

Пазьней UEFA прадставілі агляд ключавых захадаў па забесьпячэньні інклюзіўнага і паважлівага турніру для ўсіх. Акрамя Дэклярацыі правоў чалавека і мэханізма падачы скаргаў, у лік захадаў увайшлі мэханізм хуткага рэагаваньня (неадкладная дапамога глядач_кам, якія апынуліся ў небясьпецы), стратэгія UEFA ў галіне аховы навакольнага асяродьдзя, сацыяльнай сфэры і кіраваньня (ESG), інтэграцыя заўзятар_ак і Рада па правах чалавека EURO-2024.

Аднак арганізатар_кі турніру сутыкнуліся з крытыкай. У прыватнасьці, актывіст_кі зьвярнулі ўвагу на заключэньне спонсарскіх кантрактаў з кітайскімі кампаніямі, чые ланцужкі паставак, паводле некаторых зьвестак, выкарыстоўвалі прымусовую працу уйгур_ак або спрыялі сачэньню за уйгурскім насельніцтвам.

Улады Германіі прыдумалі кодавае слова пры небясьпецы з боку фанат_ак на EURO-2024. Так, пры ўзьнікненьні напружаных сітуацый або пагрозы з боку ультрас улады Германіі заклікалі грамадзян_ак выкарыстоўваць кодавае слова «панама». Такая мера дазволіць зэканоміць час пры звароце да паліцыі і пазьбегнуць цяжкасьцяў, зьвязаных з моўным бар'ерам.

Перад матчам Ангелія-Сэрбія, які скончыўся з лікам 1:0, паміж заўзятар_камі ўспыхнулі канфлікты. У сеціве зьявіліся відэа, на якіх відаць, як удзельні_цы беспарадкаў кідаюць ад_на ў адн_у сталы, крэслы і бутэлькі. На месца прыбыла паліцыя, частка заўзятар_ак былі арыштаваныя.

Мужчына атрымаў агнястрэльнае раненьне пасьля таго, як пагражаў некалькім мінакам і паліцыі малатком і кактэйлем Молатава ў фан-зоне ў Гамбургу перад матчам Нідэрлянды-Польшча. Пацярпелы быў шпіталізаваны.

"Einigkeit und Recht und Vielfalt" («Адзінства, справядлівасьць і разнастайнасьць») – дакументальны фільм пра зборную Германіі па футболе, які стаў прадметам актыўнай грамадзкай дыскусіі. У фільме закранаюць важныя пытаньні аб мультыкультурнасьці, лёсе мігрант_ак і іх інтэграцыі, праявах расізму на прыкладзе гісторый футбалістаў. Аднак асноўны фокус увагі быў сканцэнтраваны на інтэрвію з футбалістамі. Так, падчас зносін на паркоўцы мужчына, у якога бралі інтэрвію, стаў абурацца: «Дзе белыя немцы? Яны таксама могуць гуляць у футбол. Для мяне сапраўдны немец – белы». Іншы мужчына заявіў: «Афрыканец ня можа быць немцам. Гэта лягічна». Аўтар фільма Philipp Awounou папрасіў WDR правесьці рэпрэзэнтатыўнае апытаньне. Адно з пытаньняў гучала так: «Ці хочаце вы, каб у зборнай Германіі зноў гулялі больш белых футбалістаў?» З гэтым сцвярджэннем пагадзіліся 21% з 1304 рэспандэнт_ак. Дадзенае апытаньне (ня толькі яго вынікі, але і сам факт правядзеньня) выклікала негатыўную рэакцыю ў футбольнай супольнасьці; трэнер мужчынскай зборнай Германіі па футболе назваў апытаньне «расістоўскім».

Такія глябальныя спартовыя мерапрыемствы, як EURO-2024, вельмі зьвязаныя з правамі чалавека, бо яны прыцягваюць увагу міжнароднай грамадзкасьці як да пазітыўных ініцыятыў,  так і да бягучых праблем. Прыняцьце спецыяльных дакумэнтаў

5 Human Rights Declaration for UEFA UERO 2024

па забесьпячэньні правоў чалавека падчас правядзення турніру падкрэслівае імкненьне міжнародных арганізацый усталёўваць новыя стандарты. Аднак канфлікты паміж заўзятар_камі і новыя дыскусіі вакол такіх пытаньняў, як расізм, сьведчаць аб захаваных праблемах, якія патрабуюць рашэньняў. Гэтыя падзеі падкрэсьліваюць падвойную ролю спорту – як плятформы для прасоўваньня правоў чалавека і адлюстраваньня праблем грамадзтва.

# Іншыя навіны ў сфэры спорту і правоў чалавека

Сыстэма штучнага інтэлекту абароніць атлет_ак ад анлайн-аб'юзу падчас Алімпійскіх Гульняў і Паралімпійскіх гульняў-2024 у Парыжы. Сыстэма будзе адсочваць тысячы акаўнтаў на асноўных плятформах і на больш за 35 мовах у рэжыме рэальнага часу. Любыя пагрозы будуць адзначаныя і апрацаваныя, часам нават да таго, як спартоў_кі змогуць убачыць патэнцыйную абразу. Праблема анлайн-аб'юзу зьяўляецца адной з ключавых у сучасным спорце, уплывае на мэнтальнае і фізычнае здароўе атлет_ак, перашкаджае засярodзіцца на спаборніцтвах. «Бясьпечнае спартовае асяродзьдзе таксама павінна азначаць бясьпечнае лічбавае асяродзьдзе», – лічыць Kirsty Burrows, кіраўніца аддзела бясьпечнага спорту МАК.[6]

Amnesty International прадставілі справаздачу ў сувязі з сумеснай заяўкай Марока, Гішпаніі і Партугаліі на правядзеньне ЧС па футболе 2030 года і заяўкай Саудаўскай Аравіі на правядзеньне ЧС-2034. Асноўны пасыл справаздачы заключаецца ў закліку да FIFA для правядзеньня незалежнай ацэнкі рызыкаў у кожнай заяўцы, каб пераканацца ў здольнасьці краін, якія хочуць прыняць турнір, цалкам забясьпечыць захаваньне правоў чалавека, і адхіліць любыя заяўкі, якія нясуць у сабе рызыкі злоўжываньняў. Пацярпець могуць шматлікія групы – працоўныя, гул_іні і заўзятар_кі, этнічныя і рэлігійныя меншасьці, мясцовыя супольнасьці, жанчыны, прадстаўні_цы ЛГБТК+ супольнасьцяў. На думку Steve Cockburn, кіраўніка аддзела працоўных правоў і спорту Amnesty International, найбольшая колькасьць асьцярог у аспэкце забесьпячэньня правоў чалавека ўзьнікае ў перспектыве правядзеньня ЧС-2034 у Саудаўскай Аравіі.[7]

Amnesty International заклікаюць падпісаць петыцыю "Put Human Rights at the Heart of Sport". Петыцыя зьмяшчае заклік да Федэральнай рады Швайцарыі распрацаваць эфектыўныя меры для таго, каб спартовыя асацыяцыі, якія базуюцца ў краіне, выконвалі свае абавязальніцтвы ў сфэры правоў чалавека. Справа ў тым, што ў Швайцарыі знаходзіцца больш за 50 міжнародных спартовых федэрацый, аднак меры па забесьпячэньні правоў чалавека для іх не зьяўляюцца абавязковымі – існуючыя ініцыятывы заснаваныя на добраахвотных пачатках.

Нападаючы зборнай Францыі па футболе, Ousmane Dembélé, заклікаў людзей у Францыі галасаваць на выбарах у Нацыянальны сход (парлямэнт). «Я думаю, нам трэба мабілізавацца, каб прагаласаваць, усім разам», – заявіў Dembélé. FFF даюць магчымасьць для гульцоў і іншых прадстаўні_ц зборнай на EURO-2024 прагаласаваць па даверанасьці. Капітан зборнай Францыі Kylian Mbappe таксама заклікаў суграмадзян_ак галасаваць на выбарах і перасьцярог ад «крайнасьцяў»[8]. Mbappe заявіў, што хацеў пераканаць маладых людзей у тым, што іхнія галасы могуць мець значэньне. FFF заклікалі СМІ ўстрымацца ад усялякага ціску і палітычнага выкарыстаньня зборнай краіны.

У Польшчы фанат_кі "Zagłębia Sosnowiec" напалі на трэнера каманды Aliaksandr Hackiewicz. Група фанат_ак уварваліся на трэніроўку і ўдарылі Hackiewicz па твары. Па словах спартовага дырэктара клуба, Mikhail Zalevsky, фанат_ак было каля 20-30, яны выказвалі прэтэнзіі з нагоды выступу каманды. «Фанаты маюць права выказваць сваю незадаволенасьць, толькі рабіць гэта трэба цывілізаванымі мэтадамі, а не нападаць на каманду», – заявіў Zalevsky.

Фінал Кубка Чэхіі па футболе сярод мужчынскіх камандаў FC Viktoria Plzeň і AC Sparta Praha скончыўся масавай бойкай фанат_ак. Кіраўніцтва Футбольнай асацыяцыі Чэхіі

---

6 Olympic AI Agenda.
7 Playing a Dangerous Game? Human Rights Risks Linked to the 2030 and 2034 FIFA World Cups.
8 У першым туры нацыянальных выбараў у Францыі лідзіравала ультраправая партыя Marine Le Pen «Нацыянальнае аб'яднаньне».

адразу пасьля заканчэньня фінальнага матча Кубка MOL пачалі ўласнае расьследваньне інцыдэнтаў, якія суправаджалі вышэйзгаданы матч. Чэшская паліцыя клясіфікавала матч як мерапрыемства з высокай рызыкай, але да апошняга старалася не ўмешвацца ў беспарадкі, якія адбываліся на полі.

Трое заўзятараў València CF былі прыгавораныя да 8 месяцаў турэмнага зьняволеньня за злачынства на глебе нянавісьці ў дачыненьні да Vinicius Junior у траўні 2023 года. Гэта першы прысуд за злачынства такога кшталту ў Гішпаніі. Апроч турэмнага зьняволеньня заўзятарам забаранілі наведваць стадыён на 2 гады і абавязалі аплаціць судовыя выдаткі. У La Liga заявілі, што рашэньне «пасылае выразны сігнал тым людзям, якія прыходзяць на футбольны стадыён, каб абражаць, што La Liga будуць выяўляць іх, паведамляць пра іх, і гэта пацягне за сабой крымінальныя наступствы».

Гульцы CD Palestino выйшлі на поле без суправаджэньня дзяцей, але імітуючы жэст рук, якія трымаюцца ў паветры, – у знак салідарнасьці з загінуўшымі дзецьмі Палестыны. Bohemian FC згулялі таварыскі матч з жаночай зборнай Палестыны ў знак салідарнасьці і для збору сродкаў на гуманітарныя намаганьні ў рэгіёне. Матч адбыўся 15 траўня, у дзень памяці аб масавым перамяшчэньні палестын_ак падчас араба-ізраільскай вайны 1948 года.

З дапамогай Фонду футбаліст_ак FIFA і FIFPRO гульцы FK Olipmik атрымалі большую частку грошай, выплаты якіх былі затрыманыя на некалькі месяцаў пасьля распаду клюба ў яго апошнім сэзоне 2020/21.

Мужчынская зборная Даніі адмовіліся ад павышэньня сваіх заробкаў, каб жаночая зборная змаглі атрымаць роўную з імі аплату. DBU стараліся забясьпечыць роўную аплату для зборных, але ніводнай з іх не падабаўся падыход, пры якім трэба было браць грошы ў мужчынскай каманды. Тады саюз гул_інь Spillerforeningen распрацавалі плян, паводле якога гульцы мужчынскай каманды адмаўляліся ад падвышэньня заробкаў, каб забясьпечыць роўную базавую аплату для каманд за выступы ў складзе нацыянальных зборных. Зніжэньне страхавога пакрыцьця мужчынскай каманды на 15% дало магчымасьць павялічыць страхавое пакрыцьцё жаночай каманды на 50%. Падтрымка жанчын з боку калег-мужчын, і ня толькі на полі, можа дапамагчы забясьпечыць устойлівасьць і дабіцца новых вышынь.

Héctor Bellerín, гулец Real Betis FC, запускае ўласны брэнд экалягічнага адзеньня, натхнёны гішпанськай культурай і спадчынай. Bellerín выкарыстоўвае сваю медыйнасьць і рэгулярна выказваецца аб зьмене клімату і ўстойлівым разьвіцьці. Акрамя таго, Bellerín лічыцца адным з самых стыльных футбалістаў. Таму запуск такога брэнда зьяўляецца лягічнай праявай важных асьпектаў жыцьця гульца.

Разнастайнасьць пытаньняў правоў чалавека, асьветленых у спартовых навінах за аналізаваны перыяд, сьведчыць аб тым, што спартовая індустрыя ўсё часьцей становіцца арэнай змаганьня з шырэйшымі грамадзкімі праблемамі, і адлюстроўвае скрыжаваньне спорту з сур'ёзнымі пытаньнямі ў вобласьці правоў чалавека.

FairPlay – гэта праваабарончая арганізацыя ў/праз/для спорту.

Наша місія: пашырэньне магчымасьцяў для людзей у рэалізацыі спартовых правоў і правоў чалавека для роўнай, інклюзіўнай і справядлівай Беларусі і сьвету.

Наша мэта: у спартовай індустрыі паважаюцца правы чалавека.

Каб дасягнуць нашай місіі, мы:

⚽ Аналізуем палітыкі, законы і практыкі і дзелімся імі зразумелай і даступнай мовай;
⚽ Займаемся адвакацыяй на нацыянальным і міжнародным узроўнях;
⚽ Займаемся адукацыяй і асьветай, у тым ліку праз спартовыя мерапрыемствы.

Тэкст падрыхтаваны сумесна калектывам аўтар_ак.

E-mail: sport@humanconstanta.org

CC BY SA

Human constanta

FAIRPLAY
SPORT FOR FAIR, EQUAL AND INCLUSIVE WORLD